# ПАЯДЫНАК

**Нарадзіўся ў 1922 годзе ў вёсцы Лутна Шклоўскага раёна. У 1934 годзе разам з бацькамі пераехаў у г. Мінеральныя Воды Стаўрапольскага краю. Закончыў сем класаў сярэдняй школы. Вучыўся ў аэраклубе. У Чырвоную Армію прызван у 1940 годзе. З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны на фронце. Снайпер.**

**Званне Героя Савецкага Саюза старшаму сержанту Г. І. Вялічку прысвоена Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 26 кастрычніка 1943 года.**

Пра маладога салдата Вялічку загаварыў увесь камандны састаў дывізіі, калі той праходзіў яшчэ першапачатковае навучанне ў запасным стралковым палку. Атрымалася ўсё гэта нечакана і для самога Генадзя. Рота была на стрэльбішчы. Вялася стральба з вінтоўкі са становішча "лежачы". Адзін за адным салдаты падыходзілі на "лінію агню", лажыліся, стралялі, уставалі. У іх адрас несліся жарты:

– Ну як, паслаў усе кулі за малаком?

– Бабахнуў у белы свет, як у капеечку?!

Нічога іншага не чакаў і Генадзь. Аднак, калі ўлёгся, старанна і доўга цэліўся. Першы ж раз у жыцці страляў з баявой вінтоўкі! Калі на мушцы аказаўся круг мішэні, мякка націснуў на спускавы кручок. Гэтак жа спакойна выстраліў усе пяць разоў. Падняўся і перадаў вінтоўку чарговаму таварышу. Бегла зірнуў у бок мішэней, што выстраіліся над бруствeрам траншэі. Там калыхаўся чырвоны флажок. Сігнал: не страляць.

– Хто страляў? – адрываючыся ад палявога тэлефона, запытаў камандзір роты ў камандзіра ўзвода.

– Баец Вялічка, – пракрычаў той у адказ.

– Паўтарыць стральбу...

У Генадзя ёкнула сэрца. Няўжо?.. Зноў улёгся, але таго спакою ўжо не было. Выстраліў раз, два, пяць... І ўсё-такі са 100 магчымых ачкоў ён выбіў 92.

Пазней былі падзякі ад камандавання. Былі армейскія спаборніцтвы. Генадзь займаў на іх прызавыя месцы. Калі пачалася вайна, Вялічка ўжо цвёрда вырашыў стаць снайперам. З характарыстыкай выдатнага стралка ён прыбыў у 1008-ы стралковы полк, які ваяваў на Паўднёва-Заходнім фронце.

У першы ж дзень свайго знаходжання на перадавой малодшы сержант Вялічка адкрыў лік знішчаных фашысцкіх салдат і афіцэраў. На ложы яго снайперскай вінтоўкі з'явіліся адразу дванаццаць зарубак.

Ішлі дні, месяцы. Цяжкімі яны былі. Са сваёй неразлучнай вінтоўкай з аптычным прыцэлам Генадзь адступаў па дарогах Украіны і Данбаса, абараняў Растоў і Паўночны Каўказ... Выкарыстоўваў кожную магчымасць, каб "папаляваць" за пахабнымі гітлераўскімі ваякамі. Рос

лік яго баявых перамог. Ужо пад Растовам ён прыблізіўся да сотні. Больш за пяцьдзесят горных егераў нямецкай арміі знайшлі свае магілы ў прадгор'ях Каўказа.

Кожны дзень сержант Вялічка выходзіў на "паляванне". Але аднойчы са здзіўленнем пераканаўся, што гітлераўцы ганяюцца і за ім. Вельмі ўжо надакучыў ім Генадзь. На ўчастку фронту з'явіўся нямецкі снайпер. І нядрэнны. Вялічка праявіў неасцярожнасць, выдаў сябе і быў ранены.

У санбаце пабыў тры тыдні. Потым... збег.

– Не магу спакойна ляжаць, пакуль сваволіць нямецкі снайпер, – апраўдваўся Генадзь перад камандзірам батальёна. – Разумееце?

– Разумею, – стараючыся быць строгім, гаварыў капітан. – А як тваё плячо?

– Зажыло... Амаль зажыло...

– Добра, заставайся. Але толькі, каб фрыц быў знішчан у бліжэйшыя дні. Ясна?

– Ясна, таварыш капітан, – падносячы руку да пілоткі, выцягнуўся Вялічка.

Два дні лазіў сержант па перадавой. Запытваўся, дзе, калі і як былі ранены або забіты савецкія салдаты і афіцэры. Чарціў незразумелыя для іншых схемы. Думаў, узважваў і аналізаваў факты. "Дзве або тры пазіцыі мае немец", – прыйшоў да вываду Вялічка. Але дзе яны? Да болю ў вачах ён углядаўся ў нейтральную паласу, якая раздзяляла сваіх ад ворага. Міма яго ўважлівага погляду не прайшоў ні адзін узгорак, ні адзін кусцік. "Дзе б я выбраў пазіцыю?" – запытваў сябе Вялічка. Яшчэ раз уважліва агледзеў згарэўшы нямецкі танк. які стаяў на ўзгорку метраў за васемсот ад перадавых акопаў. Люк механіка-вадзіцеля адкрыт. Добрая агнявая кропка! Праўда, рызыкоўна туды забірацца. Усё праглядаецца, як на далоні. Днішча стальнога страшыдла высока над зямлёй. Значыць. забрацца туды можна ноччу і ноччу ж пакінуць яго. "Пасочым!" – вырашыў сержант і ноччу абсталяваў пад валуном добрую пазіцыю.

Дзень стамляльнага назірання нічога не даў. Нічым не праявіў сябе тут нямецкі снайпер. Вечарам Генадзь лаяў сябе на чым свет стаіць, даведаўшыся, што ў суседняй роце снайпер цяжка раніў салдата. Хацеў быў ісці туды, але перадумаў...

Час цягнуўся марудна "Няўжо зноў недзе ў іншым месцы разбойнічае? – запытваў сябе сержант. – Можа справакаваць яго?.."

Генадзь нацягнуў пілотку на загадзя абструганае палена і прыўзняў яе над валуном. У тую ж секунду па валуну ўдарыла куля. Кавалачкі каменя пасыпаліся на выцягнутыя ногі. Але з танкавага люка немец не страляў. Дзе ж ён? Генадзь працёр стомленыя вочы. "Пад адной з шырокіх гусеніц уладкаваўся", – амаль уголас сказаў Генадзь. Палена з пілоткай ледзь высунулася з-за валуна справа. Куля хлёстка ўдарыла па дрэве.

– Вось цяпер, фрыц паганы, мы ведаем, дзе ты, – гучна прагаварыў Генадзь і прыцiснуўся шчакой да ложа вiнтоўкi. Праз аптычны прыцэл агледзеў правую гусенiцу танка. Так i ёсць, пад ёй. у акопе сядзiць. Цяжка яго выкурыць адтуль. Ну, давай, паднiмi сваю галаву, паглядзi сюды. I, нiбы пачуўшы сержанта, немец прыўзняўся, упiраючыся каскай у стальныя тракi. Вельмi ж вузкая шчылiна для яго. Але... Прыклад вiнтоўкi моцна штурхнуў у хворае плячо...

Ноччу разведчыкi прывалаклi забiтага нямецкага снапера. Два "Жалезныя крыжы" меў.

Паядынак закончыўся перамогай савецкага снайпера. Чалавека з моцнымi нервамi, жалезнай воляй i свяшчэннай нянавiсцю да захопнiкаў.

Гэту свяшчэнную нянавiсць Генадзь Iосiфавiч Вялiчка пранёс праз усю вайну. 330 гiтлераўцаў знайшлi свой канец ад выстралаў мужнага снайпера. Больш за батальён гiтлераўцаў знiшчылi снайперы 3-й гвардзейскай армii, многiх з якiх вучыў старшы сержант Генадзь Вялiчка.

**Паядынак // Магiлёўская праўда. — 1970. — 25 сакавiка. — С. 4.**